В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Прыназоўнік як часціна мовы

**Прыназоўнік** — нязменная часціна мовы, якая выражае залежнасць паміж назоўнікам, лічэбнікам і займеннікам ва ўскосных склонах з іншымі словамі ў словазлучэнні і сказе.

**Прыназоўнікі выражаюць адносіны:**

- часавыя: паехаць (калі?) пасля заканчэння школы
- аб'ектныя: узяць (за што?) за руку, пайсці (па што?) па ваду
- азначальныя: праца (якая?) без заганаў
- прасторавыя: жыць (дзе?) у сяле, ісці (адкуль?) са школы, ехаць (куды?) у лес
- прычынныя: разгубіцца (па якой прычыне?) па нявопытнасці
- мэтавыя: заараць палетак (з якой мэтай?) пад жыта
- меры і ступені: вядомы (у якой меры?) да драбніц
- спосабу дзеяння: ткаць (як?) у два ніты, вязаць (як?) у дзве ніткі

**Сінтаксічная роля**

Уваходзіць у склад розных членаў сказа:
1. Міша з Валодзем ладзілі касцёр.
2. Ноч была з ціхім водсветам зорнага неба.
3. Мікола расказваў пра смешнае здарэнне.
4. Парканы сіні ў белыя гарошынкі.
5. Ціха было ў лесе.

# Разрады прыназоўнікаў

**Паводле паходжання**

- невытворныя: аб, да, для, з (са), к (ка), між, праз
- вытворныя, якія паходзяць
  - ад назоўнікаў розных склонавых формаў: за кошт, з ліку, за выключэннем
  - ад дзеепрыметнікаў: дзякуючы, пачынаючы з
  - ад прыслоўяў: насупраць, абапал, вакол, побач, пасля



© ТДА «Аверсэв»

Паводле будовы

- простыя: а, аб, ад, без, з, за, на, пад, па, праз і інш.
- складаныя: з-за, з-пад, па-за, па-над
- састаўныя: на чале з, у імя, з боку

## Ужыванне прыназоўнікаў са склонамі

| Склон | Прыназоўнікі | Прыклады |
|---|---|---|
| Р. | ад, без, да, для, з-за, з-пад, паміма, акрамя, замест, паводле, дзеля і інш. | ад берага, без кнігі, да сяла, для сябра, з-за хмары, з-пад зямлі, паміма волі, акрамя Шэмета, замест спектакля, паводле малюнка, дзеля справядлівасці |
| Д. | к, адпаведна, згодна, наперакор, услед, дзякуючы і інш. | к юбілею, адпаведна загаду, згодна раскладу, наперакор сумленню, услед брату, дзякуючы няўрымслівасці |
| В. | пра, праз, цераз, у адказ на, нягледзячы на | пра Мінск, праз пушчу, цераз балота, у адказ на запрашэнне, нягледзячы на ранні час |
| Т. | па-за, над, перад, згодна з, у сувязі | па-за ўвагай, над лесам, перад класам, згодна з рашэннем, у сувязі з хваробай |
| В.<br>Т. | за, пад | за гонар, пад камень,<br>за ракой, падназіраннем |
| В.<br>М. | аб, на | разбіўся аб асфальт, паставіць на стол,<br>раскласці на стале, аб асаблівасцях |
| Р.<br>В.<br>Т. | з | вярнуцца з экскурсіі,<br>пачакаць з гадзіну,<br>параіцца з бацькам |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Прыназоўнікі | Прыклады |
| --- | --- | --- |
| Р.<br>В.<br>М. | у (ў) | пазычыць у сябра,<br>зайсці ў дом,<br>быць у школе |
| Д.<br>В.<br>М. | па | надаіць па вядру малака,<br>звярнуцца па дапамогу,<br>блукаць па лесе |

## Правапіс прыназоўнікаў

| Разам | Асобна | Праз злучок |
| --- | --- | --- |
| замест, наконт, накшталт, зверх, наперадзе, наперакор, насустрач, уперад, наперадзе, услед, нягледзячы (на) | у галіне, у адносінах, у адрозненне, па меры, за выключэннем, у сувязі, з мэтай, на працягу | з-за, з-пад, з-над, па-за, з-паміж, па-над |

## Марфалагічны разбор прыназоўніка

### Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.

2. Марфалагічныя прыметы: нязменнае слова, разрад паводле паходжання, разрад паводле будовы, з якім склонам ужыты.

3. Сінтаксічная роля (у склад якога члена сказа ўваходзіць).

### Узор разбору

На усходзе бляск агністы літым золатам дрыжыць (Я. Колас).

*На* (усходзе) — прыназоўнік, выражае разам з назоўнікам прасторавае значэнне; нязменнае слова, невытворны, просты, ужыты з месным склонам назоўніка.

У сказе ўваходзіць у склад акалічнасці.



© ТДА «Аверсэв»